УДК 39:688.72/73

# ЦАЦКІ-ПРЫЛАДЫ ДЛЯ ГУЛЬНІ Ў БЕЛАРУСАЎ

*канд. гіст. навук С.У. КАСЦЮКЕВІЧ*
*(Полацкі дзяржаўны уніеерсітэт)*

*На падаставе вывучэння беларускіх народных цацак у музеях Беларусі і за яе межамі аналізуецца выкарыстанне цацак-прылад для гульніў народных гульнях беларусаў. Разглядаюцца не толькі функцыі беларускіх народных цацак, але і іх сімвалічны сэнс у культуры беларусаў.*

Цацка - гэта прадмет для дзіцячых гульняў. Узнаўляючы рэальныя і ўяўныя вобразы, дапамагае дзіцяці пазнаваць навакольны свет, служыць адным са сродкаў разумовага, эстэтычнага, фізічнага выхавання [1, с. 387]. Звычайна, калі размова ідзе аб цацках, мы ўяўляем сабе цацкі ў выглядзе жывёл, ці лялькі, аднак першымі цацкамі чалавека былі прадметы з навакольнага асяроддзя. Прадметамі для дзіцячых гульняў былі рознакаляровыя каменьчыкі, ракавінкі, шышкі і іншыя прыродныя рэчы. Асэнсаваны выраб цацак, верагодна, адносіцца да эпохі неаліту [2, с. 636]. На стаянцы Камень знойдзена каля 40 тысяч апрацаваных камянёў, некаторыя з якіх даследчыкі адносяць ці да культавых вырабаў, ці да цацак. На стаянцы Пагост-Загорск знойдзена каля 50 мікралітычных вырабаў, сярод якіх ёсць, магчыма, і такія, якія выконвалі ролю цацак. У раннім жалезным веку ў якасці цацак маглі выкарыстоўвацца таксама гліняныя грузікі, рытуальныя збаночкі і хлебцы. У паўночнай Беларусі часам сустракаюцца галёначныя косці дробных жывёл і птушак з прасвідраванай адтулінай - так званыя «жужаліцы», вядомыя і пазней па традыцыйных гульнях беларускіх дзяцей [2, с. 636].

Традыцыйны набор цацак беларусаў склаўся да 2-й паловы XIX ст. Пакупная цацка рэдка трапляла ў дзіцячы побыт і лічылася сапраўдным цудам. Цацкі былі саматробнымі, зладжанымі бацькамі, ці старэйшымі дзецьмі. Увесь набор дзіцячых цацак умоўна можна падзяліць на ***вобразныя цацкі*** (антрапаморфныя, зоаморфныя) і ***цацкі-прылады для гульні.***

Да антрапаморфных будуць адносіцца цацкі - выявы людзей, да зоаморфных - выявы жывёл, да «цацак-прылад для гульні» - цацкі ў выглядзе прылад працы, посуду, зброі, мэблі а таксама дапаможныя прадметы для гульні - мячы, кійкі і інш. У апошнюю групу павінны ўвайсці так званыя «буркалкі», «мішчалкі», «трашчоткі», «бразготкі» і інш. Гтыя цацкі сустракаюцца ў музейных калекцыях. У дадзеным артыкуле робіцца спроба прааналізаваць традыцыйны набор беларускіх народных цацак-прылад для гульні.

***Цацкі-прылады для гульні*** падзяляюцца на *дзіцячы цацачны посуд* - прадстаўлены паменшанымі копіямі хатняга начыння; *гукавыя, рухомыя і імітацыйныя цацкі* - гэта цацкі якія імітуюць дарослыя рэчы - «лук», «стрэльба», цацачны посуд, цацачныя музычныя інструменты, цацкі, якія прызначаны для гучання («трашчоткі», «свісцёлкі»), цацкі-прылады, на якіх дзіця можа перамяшчацца («санкі») і г.д. Існуюць сярод цацак рэчы, аналагаў якім у культуры дарослых няма: «трашчоткі», «свісцёлкі,» «пукаўкі», брусочкі, кубікі, мячы і г.д. Некаторыя цацкі дзеці выраблялі самі з прыродных матэрыялаў. Кожная з цацак мела свае функцыі ў дзіцячай гульні. Агульнай характарыстыкай цацак з'яўляецца іх шматфункцыянальнасць. Верагодна, што цацкі дадзенай групы з'явіліся раней вобразных, паколькі, як вядома, першымі цацкамі былі падручныя прадметы. Ператвараюцца яны ў цацкі тады, калі дзіця знойдзе схаваныя ў іх магчымасці для забавы. Такім чынам прадметы ператвараюцца ў зноў «вынайдзеныя» і «прыстасаваныя», але магчымасць такога «вынаходніцтва» і «пераўтварэння» дадзена толькі дзецям. Здольнасць змены «рэальнага» света ў свет «гульнёвы» паходзіць з магчымасцяў дзіцячай фантазіі [2, с. 140].

У культуры беларусаў традыцыйная цацка выконвала шэраг функцый, якія вызначалі яе месца ў побыце людзей. Цацка з'яўлялася прадметам, які адлюстроўваў узровень матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей грамадства на той, ці іншай ступені развіцця. Цацкі сведчылі аб падыходах да выхавання дзяцей, адначасова яны адлюстроўваюць этнічныя асаблівасці.

У народных цацках назіраюцца ўстойлівыя мастацкія рысы, якія захоўваюцца на працягу значнага прамежку часу, нават тады, калі грамадства ўжо перайшло на новы тэхналагічны ўзровень. Цацка народный майстрамі ствараецца ў адпаведнасці з канонамі народнага мастацва, народнымі традыцыямі, якія перадаюцца з пакаленне ў пакаленне. Пры дапамозе цацак дзіця засвойвае мастацкія густы грамадсгва. Галоўнай функцыяй такіх цацак выступае гульнёвая ці забаўляльная функцыя. Аднак трэба адзначыць, што спецыяльных выхаваўча-развіваючых мэт сяляне не ставілі, перш за ўсё трэба было чымнебудзь заняць дзіця, каб мець магчымасць управіцца з працай [4, с. 189].

Набор ***цацак-прылад для гульніў*** беларусаў досыць прадстаўнічы. Традыцыйныя ***цацкі-прылады для гульні*** вядомы нам з археалагічных раскопак, музейных збораў і апісанняў этнографаў XIX - пач. XX ст., некаторыя з іх выкарыстоўваюцца ў гульнях сучаснымі дзецьмі. Выпадковыя прадметы (каменьчыкі, палачкі) выкарыстоўваліся беларусамі ў якасці дзіцячых забавак. «Чым бы дзіцёнак не бавіўся, абы не

плакаў» - лічылі беларусы [5, с. 22]. Такія прадметы рэдка збіраліся музеямі, аднак іх можна раглядаць у якасці цацак, бо яны выкарыстоўваліся дзецьмі ў час гульняў.

У найболын буйных музейных зборах беларускай народнай цацкі ў Музеі старажытнабеларускай культуры ІМЭіФ НАН Беларусі і Расійскім этнаграфічным музеі ў Санкт-Пецярбургу, паводле падлікаў, каля 20 % складаюць ***цацкі-прылады для гульні.*** У большасці музеяў Беларусі цацкі ў калекцыях адсутнічаюць, ці прадстаўлены вобразнымі цацкамі сучасных майстроў.

Сярод беларускіх народных гульняў шмат такіх, у якіх выкарыстоўваецца ***гульнёвы інвентар.*** Напрыклад, гульня «кашка» патрабуе «лыжкі» (хустачка, палачка, шышка, галінка, каменьчык і г.д.), у гульні «клёк дарожны» патрэбна палачка «клёк» - завостраная з абодвух бакоў цурачка, у гульні «птушка» выкарыстоўваецца адна біта і дзесяць гарадкоў, у гульні «падсечка» - маленькі мяч, у гульні «кольцы» - дваццаць звязаных паміж сабой колцаў з лазы дыяметрам 20 - 30 см, у гульні «качка» - мячык, у гульні «золата» - пярсцёнак, у гульні «у дзеда і бабу» - патрэбна галінка дрэва, у гульні «карона» - скрутак саломы, для гульні «іванка» - лялька ці мяч, у гульні «падхват» - санкі, шышкі і іншыя невялікія прадметы, у гульні «пабелка» - шар дыяметрам да аднаго метра, у гульні «арол» - мяч, у гульні «млын» - кубік, у гульні «зачэп» - стол, у гульні «чарадзей» - патрэбен мячык, у гульні «ліскі» невялічкі прадмет павінен быць у руках кожнага з удзельнікаў, у гульні «касары» патрэбны дзесяць цурачак і г.д. [6, с. 29]. Гэтыя рэчы ў дадзеным выпадку выконваюць гульнёвую функцыю, а таму могуць разглядацца ў якасці ***цацак-прылад для гульні.*** У калекцыі РЭМа, сабранай А.К. Сержпутоўскім захоўваюцца ***«рёзанкі»*** (26 драўляных палачак для гульні) [7]. Ёсць у РЭМе драўляная цацка ***«пыж» («трапыж»),*** набытая Е.Р. Раманавым у Быхаўскім павеце Магілёўскай губерні ў 1904 г. Там жа набыта цацка ***«кацёлка»*** - кавалак дрэва, які выкарыстоўваўся ў гульнях [8]. Назвы гульнёвых прадметаў у дадзеным выпадку паходзяць ад назваў гульняў - ***«пыж»*** [9, с. 251], ***«кацёлка»*** [9, с. 284], ***«перагон»*** («пірагонь») [9, с. 285]. Дзякуючы Е.Р. Раманаву ў калекцыю з Магілёўскай губерні трапілі такія цацкі-прылады для гульняў, як ***«чыжык»*** (выкарыстоўвалася для гульні «у чыжа») і ***«пірагокь»*** [10]. Гульні ***«ў мяч», «у кісценя», «у салаўя»*** апісаны ў зборніку беларускіх гульняў [9, с. 263]. Запісы зроблены ў Быхаўскім павеце. Гульні з інвентаром былі распаўсюджаны на ўсёй тэрыторыі Беларусі.

Цікавыя прылады для гульні «у мяч»: гэта «мяч» - кавалак дрэва, лапатка для адбівання мяча (дошчачка даўжынёй 34 см, шырынёй 5 см) і калочак даўжынёй 16 см (пры гульні ўбіваецца ў зямлю). Цацкі паходзяць з вёскі Жываглодавічы Сенненскага павета Вязненскай воласці Мінскай губерні. Сабраны цацкі А.К. Сержпутоўскім [11]. Дадзеная гульня «у мяча» апісана А.К. Сержпутоўскім і з'яўляецца лакапьнай назвай гульні «ў чыжа».

***Мяч*** вядомы ў многіх народаў свету. Яго ведалі яшчэ старажытныя грэкі, спартанцы і лідзійцы. Традыцыйныя гульні ў мяч былі распаўсюджаны ў многіх народаў свету. Мяч уяўляў сабой клубок з воўны або паклі, чым-небудзь пакрыты зверху і абшыты скурай. Калі-некалі ў яго клалі рыб'і ці цялячыя храшчыкі для спружыньвання. Такі мяч выкарыстоўвалі для гульні рукамі і нагамі. Сустракаецца мяч і сярод традыцыйных цацак беларусаў. Звычайна яго рабілі са скуры і набівалі воўнай, пер'ем, часам, для спружыньвання ўкладвалі ўнутр храшчыкі жывёл. Часта ў дзіцячых гульнях беларусаў замест мяча выкарыстоўвалася рукавіца, набітая сенам, шапка і г.д., аб чым маюцца паведамленні ў апісанні гуьняў [9, с. 267]. Для некаторых гульняў дзеці ўжывалі адмысловыя мячы. Так, К. Машынскі запісаў у 1914 г. у Мазырскім павеце гульню, у якой «мяч бывае такой велічыні, як два курыных яйца разам» [9, с. 269]. У гульню гуляюць толькі вясной, «калі ўжо снегу няма, а хлопцы маюць яшчэ шмат вольнага часу» [9, с. 270]. У зборах музеяў ёсць і драўляныя мячы. У калекцыі РЭМа захоўваецца драўляны мяч з Быхаўскага павета Магілёўскай губерні, з лакальнай назвай - «салавей» [12]. Назва цацкі паходзіць ад назвы гульні - «у салаўя» [9, с. 262 - 263]. Існуе цацка з аналагічнай назвай у цацачным гліняным посудзе. Там назва паходзіць, відавочна, ад гука, які атрымліваецца, калі ў нутро запоўненай вадой пасудзіны пачынаюць удзьмуваць паветра.

Вядома больш за трыццаць беларускіх гульняў з мячом [*9, с. 487 - 491]. Вось некаторыя з іх: «два вогні», «салавей», «кісцень», «мета», «горад-поле», «грахі», «штандар» («спаймай птушку»), «вышыбала», «рагавы» («чорт»), «воўк», «шута», «птушкі ляцяць», «цар», «ямачкі», «мячык», «яркі», «дучкі», «бульбачка», «гаротнік», «выбіткі» і г.д. [9, с. 261 -278].

Мяч у старажытнасці выконваў і гульнёвую, і сакральную функцыі. У традыцыйнай культуры круг, кола мае сакральны сэнс. Сфера, кола былі сімвалам упарадкаванасці прасторы, сімвалам касмічнага парадку. Шырока распаўсюджана тэорыя аб паходжанні мяча ад сакральнага прадмета. Рэшткі ўяўленняў аб мячы як сакральным прадмеце захаваліся да нашага часу. Так, у паўночна-амерыканскіх індзейцаў да мяча нельга было дакранацца рукамі. Мяч лічыўся сімвалам Сонца, Месяца, Зямлі, што пацвярджае тэорыю аб тым, што некаторыя віды амулетаў і ідалаў былі першымі мадэлямі планет і зорак [13, с. 170].

Ва ўсходніх славян распаўсюджаны гульні з мячом, акрамя таго, мяч выкарыстоўваецца ў некаторых абрадах. У беларусаў не захавалася рэштказ старажытных уяўленняў атаясамлення мяча з Сонцам ці Месяцам, аднак выкарыстанне мяча ў некаторых абрадавых дзеяннях дае падставу меркаваць,

што мяч ператварыўся з амулета ў аб'ект гульні, страціўшы свае магічныя функцыі. У некаторых мясцовасцях існаваў вясельны прыгавор «на мяч», які сведчыў, што мячом гулялі пад час вясельнага абраду [13, с. 162 - 163]. Асабліва папулярнымі былі гульні з мячом пад час летняга сонцастаяння. Некаторыя даследчыкі звязваюць паходжанне слова *шяч»* са словам *«метюсе»* (ад дзеяслова *«метать»*), гэта значыць *выбіраць*. Прыводзяцца шэраг гульняў з выкарыстаннем мяча, мэтай якіх быў выбар партнёра. Акрамя таго, гульні ў мяч былі распаўсюджаны ў час сонцаварота, што паказвае на атаясамленне сонца і мяча (шара), якое згодна з міфалагічнымі ўяўленнямі валодала жаночай прыродай [13, с. 164 -165]. Выкарыстанне мяча ў маладзежных веснавых гульнях мела на мэце абуджэнне плодных сіл зямлі ў адказны для земляроба перыяд вяснавых палявых работ. Мячы рабілі з поўсці, ільняных валокнаў, анучаў, ваты, кары дрэў, скуры. Паступова абрадавая функцыя мяча зніжаецца і выступае на першы план бытавая, гульнёвая функцыя.

Мяч страціў сваю магічную функцыю вельмі хутка, дзякуючы падабенству з яйкам [13, с. 166]. Т.А. Бернштам, разглядаючы праблему паходжання абрадаў, звязаных з мячом, прыходзіць да высновы, што мяч у абрадавых гульнях быў заменены на яйка [13, с. 162]. Сярод шарападобных рэчаў з гульнёвай функцыяй яйка стаіць асобна, бо захавала найбольш сімвалічных архаічных элементаў.

Шарападобныя прылады для гульні сустракаюцца дастаткова часта ў археалагічных раскопках, напрыклад - мурмелынпіль.

***Мурмельшпіль*** - гліняныя альбо каменныя шарыкі для гульні ў каменьчыкі. Трапляюцца пры раскопках замкаў і гарадоў у пластах XVI - XVII стст. На Віцебскім Верхнім замку і ў Слуцку іх знойдзена больш за дваццаць. Віцебскія мурмельшпілі выраблялiся з тлустай гліны альбо вапняку (дыяметрам 9-30 мм, вага 0,7 - 26,5 г), слуцкія - з чырвонай і шэрай гліны (дыяметрам 1,9 - 2, 6 мм, вага 4,7 - 13,75 г). Мурмельшпіль знойдзены пры раскопках у Мінску, Дзісне, Дрысвятах, Крычаве, Чачэрску і шэрагу іншых беларускіх гарадоў; вядомы пры раскопках у Рызе і замках Прыбалтыкі [2, с. 447]. Гульнёвае прызначэнне дадзеных прадметаў бясспрэчна, аднак не выключана і магічная функцыя. Для народнай цацкі ўвогуле характэрна імкненне да акругласці формаў, сфероіднасці. Відавочна падобная рыса ў гліняных традыцыйных цацках, дзякуючы пластычным якасцям матэрыялу, але прысутнічае і ў цацках з іншых матэрыялаў. Тлумачэнне падобнай формы можна знаходзіць ва утылітарнай функцыі цацкі (маўляў, форма, зручная для выкарыстання: «каб дзіця не паранілася»), але верагодней тлумачэнне падобнай формы ляжыць глыбей.

***Яйка*** з каменю, ці гліны, з'яўляецца частай знаходкай пад час археалагічных раскопак.

У зборах музеяў сустракаюцца цацкі ў выглядзе яйка з гліны ці дрэва. У Кракаўскім этнаграфічным музеі захоўваюцца яйкападобныя арнаментаваныя варабы з гліны, якія паходзяць з тэрыторыі Беларусі. Спрэчным застаецца пытанне іх прызначэння.

Звяртае на сябе ўвагу сувязь вялікодных яек і яек цацачных. Даследчык народнай цацкі М.М. Цэрэтэлі лічыць, што такі від цацак з'явіўся як вынік вялікоднай традыцыі [14, с. 26]. Ён разглядае толькі цацкі вышэйшых саслоўяў і не выкарыстоўвае дадзеныя археалогіі.

Ёсць цацачнае яйка і сярод цацак РЭМа - гэта вытачаная на такарным станку цацка, якая складаецца з дзвух частак. Яна пафарбавана ў чырвоны колер, мае дыяметр 4 см, паходзіць з Гомельскай губерні [15]. Цацка відавочна імітуе вялікоднае яйка, аднак прызначана для дзіцячай гульні.

Аб значэнні яек ў абрадах беларусаў сведчаць шматлікія паведамленні этнографаў. Беларусы верылі, што яйка можа паўплываць на здароўе, прыгажосць, пачуцці, ураджайнасць зямлі. Яйка часта выкарыстоўвалася ў магічных прыёмах. Так, у дзень першага выгану жывёлы на поле, гаспадар дакранаўся яйкам да галавы жывёлы і казаў: «Як гэтае яйка гладкае і круглае, так і мая кароўка будзь гладкай і круглай» [16, с. 38]. Вядомы звычай, калі на Юр'я красілі яйкі, як і на Вялікдзень, і давалі іх пастуху. Пастух павінен быў насіць яйкі ўвесь дзень, каб «говядо наядалася й было круглае бы *яйцо»* [17, с. 76]. А.К. Сержпутоўскі паведамляе, што ў першы дзень выпасу жывелы «ў варотах закопваюць у зямлю бязьмен, замок, сякеру й курынае *яйцо,* а зверху пасцілаюць салому да запальваюць яе. Говядо праганяюць цераз той агонь... Калі яйцо гавядо не разаб'е, та яно аб восень будзе ўсё цэло...» [17, с. 75].

Пачуўшы першы гром з курыным яйкам беглі да крыніцы і мыліся крынічнай вадой, дакранаючыся да твару яйкам [16, с. 38]. Лічылася, што як яйка чыстае і круглае, так і твар будзе чыстым і круглым.

Яйка - полісемантычны, складаны сімвал, адыгрывае важную ролю шмат у якіх абрадах: аграрных, памінальных, якімі вяснова-летні час насычаны, а зітаванасць, злітнасць іх абумовіла амаль універсальную функцыю яйка-сімвала, якую трактуюць як плодную. Магічныя дзеянні з мэтай забеспячэння ўраджайнасці зямлі прынята бачыць і ў генезісе гульнёвага катання яек моладдзю, хоць у дадзеным выпадку яйка не толькі сімвал мужчынскага пачатку, але і носьбіт андрагіннага - гэта значыць яйка магло сімвалізаваць і мужчынскі і жаночы пачатак адначасова [13, с. 167]. У вясельных абрадах беларусаў прусутнічае дарэнне маладым яек «з-пад чорнай куры» [9, с. 219].

Паказальна, што перыяд дзяцінства атаясамліваўся з яйкам: «да пяці год пястуй дзіця, як ***яечка*** (курсіў аўтара) з сямі - пасі, як авечку, тады выйдзе на чалавечка» [18, с. 13]. Часта беларусы выкарыстоўвалі пры гадоўлі дзяцей магічныя прыёмы, звязаныя з яйкам: «калі ўжэ дзіця становіцца ці саўсім пачынае дыбаць, та яму больш не даюць цацкі... даюць ***яйцо.*** - Ось гэто цаца, кажэ матка. - А да тых часоў дзіцяці ***яйца*** не даюць» [17, с. 183]. «Калі дзіця стаіць, але доўго не ходзіць, та перад ім трэба качаць курынае ***яечко*** й падражніваць дзіця, каб яно лавіло тое ***яечко.*** Дзіця хутко пойдзе» [17, с. 184].

Часцей за ўсё яйка ў міфалогіі звязана з міфамі аб пабудове свету. «Уяўленне пра яйка як пра мікракосм, у якім адлюстраваны Сусвет, цягнецца з самай старажытнасці», - адзначае Б.А. Рыбакоў [19, с. 52]. Касмічнае яйка з’яўляецца міфапаэтычным сімвалам. У шматлікіх паэтычных традыцыях вядомы вобраз міфалагічнага яйка, з якога ўзнік сусвет ці нейкая творчая сіла: бог, герой-дэміург, а ў некаторых выпадках - чалавечы род. М. Эліадэ прыводзіць шэраг прыкладаў з касмаганічных міфаў, калі гісторыя пачынаецца ад стварэння свету з яйка [20, с. 27]. У такіх міфах падкрэсліваецца не толькі скрытая патэнцыя, закладзеная ў яйку, але і ўласцівасць яйка дзяліцца на часткі, з якіх утвараюцца розныя стыхіі. Сустракаюцца матывы паходжання з верхняй ці ніжняй паловы міфалагічнага яйка неба і зямлі. Нярэдкімі з’яўляюцца легенды аб стварэнні першага чалавека з яйка. Яйка можа быць сховішчам для душы, яго ўвогуле народная культура разумее як сховішча чаго-небудзь [20, с. 31]. У украінцаў існуе легенда аб стварэнні свету, у якой певень нясе яйка, з якога выцякаюць сем рэк. Яны аплядняюць зямлю, яна пачынае квітнець. Певень кожную раніцу будзіў людзей, узгадваючы ім аб калі трэба працаваць. Калі надакучыла людзям працаваць, яны прагналі пеўня, а цудадзейнае яйка разбілі. «З разбітага ***яйка*** пацякла вада, затапілаўсю зямлю і прыйшоў канец свету» [21, с. 20].

У шматлікіх выпадках міфалагічнае яйка апісваецца як залатое, часам яму прыпісваюцца атрыбуты Сонца. Магчыма з адгалоскаў салярных культаў паходзіць імкненне да сакралізацыі акруглых форм. Яйка азначае патэнцыяльную магчымасць, насенне, таямніцу жыцця. Так, беларусы каталі вялікодныя яйкі па полю, каб абудзіць плодныя сілы зямлі [22, с. 19]. Яйка разумелася і як касмічны сімвал, які можна знайсці ў большасці сімвапічных традыцый. Яйка ў выглядзе сямі згарнутых слаёў азначала сем нябесных сфер у грэкаў. Адкладванне яйка з’яўляецца эквівалентам нараджэння чалавека, а вылупленне з яйка сімвалізуе другаснае нараджэнне - ініцыяцыю [20, с. 30]. Яйка ўзгадваецца ў беларускіх народных казках. З яйка нараджаецца ўвасабленне злой сілы, у прыватнасці, у беларусаў - цмок [23, с. 105].

Касмаганічная роля яйка суадносіцца з важнай функцыяй яек у рытуальнай вялікоднай абраднасці беларусаў. У беларускай версіі вядомай казкі пра залатое яйка, знесенае курачкай, якую запісаў Е.Р. Раманаў, яскрава праяўляецца атаясамленне яйка са светам і парадкам у свеце. Разбіванне яйка вядзе ў казцы да страты парадку ў свеце (варона губляе крылы, дуб ламае галінкі, рака ператвараецца ў кроў, дзяўчына б’е вёдры) і згубы чалавечага дастатку - перавернута дзяжа - сімвал дабрабыту [24, с. 84 - 85]. У беларусаў яйка выкарыстоўваецца ў лекавай магіі пры лячэнні розных хвароб, напрыклад, пры дапамозе яйка ад белай курыцы лячылі бяльмо на воку [17, с. 211]. Яйку надавалі засцерагальныя ўласцівасці. Лічылі, што калі вялікоднае яйка пакласці ў зерне, то яно зберажэ ўраджай ад граду і злога вока [16, с. 39]. З вобразам яйка звязана часавая структура цэлага, ці асобных адрэзкаў часу (напрыклад, загадка: «Ляжыць брус праз усю Русь, на брусе дванаццаць гнёзд, у кожным гняздзе - па чатыры яйкі, у кожным яйку - па сем птушанят» (адгадка: год і яго часткі)). Звычайна акт тварэння звязваюць з тым, што сусветнае яйка разбіваецца, узрываецца, кінутае ў неба. У беларусаў у час вяселля звычайна цешча падавала зяцю страву з яек. Вялікодныя яйкі ў сялянскай хаце захоўвалі за іконамі ад аднаго свята (увесь год) да наступнага. У гэтым выпадку мае месца элемент уплыву хрысціянскіх традыцый на старажытныя звычаі [22, с. 6]. Яййа бралі з сабой, калі пачыналася ворыва. Вялікоднае яйка закопвалі, гэта павінна было стымуляваць плоднасць зямлі. У шэрагу выпадкаў з тэмай яйка звязваецца бог з функцыямі грамавержца. Пад час буры выносілі кошык з вялікоднымі яйкамі, лічылася, што гэта суцішыць грымоты [22, с. 10].

Цацка захоўвае ў сабе найвялікшую мудрасць продкаў. У простай і даступнай форме знаёміць дзіця са светам. Р. Кайуа, аўтар кнігі «Гульні і людзі», сцвярджае: «гульня - атрыбут чалавечнасці. Гульня - ёсць будаванне «паралельнай рэальнасці» побач са звычайным жыццём у выпадку гульні дарослых, а ў выпадку гульні дзяцей - гульня ёсць спосаб засваення рэальнага свету. Правілы гульні дапамагаюць засвоіць правілы цывілізацыі, культуры, грамадства» [25, с. 11].

***Дзіцячы цацачны посуд*** складае значную групу цацак. У беларускіх традыцыйных цацках ён прадстаўлены керамічнымі і драўлянымі вырабамі. Драўляныя вырабы звычайна тачоныя на 'такарным станку. Адрозніваюцца невялікімі памерамі, аднак яны большыя за рускія ***«бірулькі».*** «Бірулькамі» называлі звычайна камплект дробных цацак (да 30), якія прадстаўлялі розныя пабытовыя рэчы, посуд і змяшчаліся ў каробачцы. Гульня заключалася ў тым, што гуляючыя па чарзе выцягвалі з каробачкі цацкі і складалі з іх наборы, падбіраючы па колеру і мэтаваму прызначэнню. Гульня завяршалася тады, калі хтосьці першы збіраў свае «бірулькі». Гульня патрабавала цярплівасці, трэніравала маторыку і каардынацыю рухаў. Гульня з беларускім цацачным посудам патрабавала тых жа навыкаў. У беларусаў цацачны посуд рабілі як з гліны, так і з дрэва. Асобных цэнтраў вырабу цацак на Беларусі не было. Цацкі ў

выглядзе посуду майстры рабілі разам з гаспадарчым начыннем. Цацачны посуд прызначаўся для дзяўчынак, яны павінны былі гуляючы з ім знаёміцца з назвамі гаспадарчых прадметаў, даведвацца аб функцыянальным прызначэнні кожнага віду посуду. Паўтараючы дзеянні старэйшых, вучыліся гатаваць ежу, выкарыстоўваць посуд строга па прызначэнню. Напрыклад, дзеці запаміналі, што ў «гаршчках» захоўвалі вадкасці, «абеднікамі» называлі пасудзіны, з якіх елі, у самых маленькіх гаршчках («гарнушак», «гарнуль», «пітушка») парылі малако, гатавалі кашу, заварвалі лекавыя расліны, у гаршчках сярэдніх памераў («сагачык», «паўзлівач», «злівач», «нярознік») гатавалі ежу на ўсю сям'ю [26, с. 106]. Усе лакальныя асаблівасці вырабу былі адлюстраваны ў цацачным посудзе.

У калекцыі РЭМа, сабранай з Магілёўскай і Гомельскай губерній, утрымліваецца 11 прадметаў цацачнага дзіцячага посуду, вытачанага з дрэва. Вышыння кубкаў не перавышае 2,5 см, дыяметр 1,5 см; дыяметр талерак не перавышае 3,5 см [27]. Цацачныя гаршкі, вазы для кветак, зробленыя майстрам М.М. 'Гакарэўскім у 30-я г. XX ст., захоўваюцца ў Музеі Беларускага Палесся ў Пінску.

Керамічны цацачны посуд быў такіх'жа малых памераў. Ён захаваў назвы сапраўднага посуду і дакладна капіраваў формы і прыёмы апрацоўкі і афарбоўкі керамічнага гаспадарчага начыння. Цацачны посуд апрацоўваўся таксама як і гаспадарчае начынне.

Самым распаўсюджаным з'яўляецца звычайны светлы глянцаваны (тэракотавы) цацачны посуд, які ў залежнасці ад гатунку гліны бывае ці зусім светлым (як у Гараднай), ці амаль чырвоным (як у Бабінавічах). Такі посуд распаўсюджаны на Віцебшчыне і Магілёўшчыне. У Цэнтральнай Беларусі (Івянец, Ракаў, Мір) - свае асаблівасці, якія адрозніваюцца ад паўночна-усходняга рэгіёна (Бабінавічы, Копысь, Дуброўна) і ад развіцця цэнтраў ганчарства на Палессі (Пружаны, Ружаны, Гародная) [26, с. 105].

Чорны задымлены цацачны посуд ёсць у калекцыі РЭМа. Гэта «самавар», «чайнікі», «кубакі» [28]. У той жа калекцыі ёсць паліваныя чырвонай палівай керамічныя дзіцячыя пасудзіны з Сенненскага павета Магілёўскай губерні [29]. Цэлы набор з самаварам, кубкамі і талеркамі захаваўся ў калекцыі з Магілёўскай і Гомельскай губерняў [30]. Цікавыя цацачныя «двайнікі» («спарышы»), што дакладна капіруюць гаспадарчае начыннне, ў якім насілі «ў поле» абед. Двайнікі ёсць у зборах РЭМа [31]. Сабраны Е.Р. Раманавым у вёсцы Машчэны Сенненскага павета Магілёўскай губерні.

Асабліва цікавымі сярод цацачнага посуду для гульні падаюцца «салаўі», «свісткі» - цацачныя пасудзіны адмысловай формы ў выглядзе гаршчочка з дзюбкай. У такую пасудзінку залівалася вада, а ў дзюбку надзьмувалася паветра і тады атрымоўваўся гук-трэля. Для дзяцей гэта была танная і займальная цацка. Прыклады такіх «салаўёў» захаваліся ў зборах РЭМа [32]. Народныя майстры XX ст. таксама выраблялі падобныя цацачныя пасудзіны. Такія рэчы сустракаліся на кірмашах да сярэдзіны XX ст. і былі папулярнай забавай вясковых дзяцей.

ІДікавай з'явай у беларускай цаццы пачатку XX ст. стала з'яўленне сярод характэрнага набору цацачнага посуду такарных «самавараў». Гэты прадмет начыння не з'яўляецца традыцыйным для беларусаў, яго з'яўленне звязана з культурным перайманнем. З дарослага асяроддзя рэч і трапіла ў цацачны асартымент. Невялічкі «самавар» зроблены з дрэва, які паходзіць з Магілёўскай губерні, захоўваецца ў сховішчах РЭМа [33].

Цацачны посуд прызначаўся для дзіцячых гульняў, у якіх вясковыя дзеці навучаліся хатняй гаспадарцы, вывучалі назвы рэчаў. Можна меркаваць, што дзяўчынкі карысталіся гэтым відам цацак часцей, бо менавіта ім належала стаць добрымі гаспадынямі.

Групу цацачнага посуду можна назваць яшчэ і ***імітацыйнымі цацкамі,*** паколькі цацкі паўтаралі дарослыя прадметы. Да групы імітацыйных цацак адносіцца таксама цацачная зброя.

***Цацачная зброя*** - гэта група цацак, якія капіравалі зброю дарослых. Такія цацкі сустракаюцца сярод збораў музеяў і ў археалагічных раскопках. Імітацыі прадметаў узбраенння з дрэва, косці і металу даволі часта сустракаюцца археолагамі. Сярод археалагічных знаходак сустракюцца дзіцячыя мячы, дзіды, лукі, стрэлы, кінжалы, сякеры. На тэрыторыі Беларусі рэшткі драўляных мячоў знойдзены ў Гародні, Менску, Бярэсці, Слуцку, Слоніме. Археолагі іх датуюць XII - XIII стст. [34, с. 154]. Археолагі адзначаюць, што рукаяткі мячоў мелі розныя памеры, што сведчыць пра розны ўзрост іх уладальнікаў. У Бярэсці знойдзены цэлы драўляны меч, які мае даўжыню 86 см і адносіцца да сярэдзіны XII ст. Даследчыкі лічаць, што знойдзеныя археалагічныя цацкі можна падзяліць на зробленыя дарослымі і вырабленыя самімі дзецьмі. Розніца паміж імі праслежваецца ў апрацоўцы і ўзроўні майстэрства. Слушным падаецца меркаванне, паводле якога цацачная зброя выкарыстоўвапася дзеля таго, каб у ваенных гульнях дзеці атрымоўвалі першасныя ваенныя навыкі і рыхтаваліся да няпростага жыцця, напоўненага ў сярэднявеччы войнамі [34, с. 155]. Цацачная зброя была прыналежнасцю хлопчыкаў, паколькі яны павінны былі стаць ваярамі і абаронцамі, што натуральна вынікала са строгай дыферанцыяцыі сацыяльных роляў у традыцыйным грамадстве. Відавочна, прычынай узнікнення цацак гэтай групы было капіраванне дарослых прадметаў. Да такіх цацак адносяць «лукі», «ружжы» («стрэльбы»), цацачныя «мячы», «нажы» і г.д.

Даследчык М.А. Плавінскі называе дадзеныя цацкі «мілітарнымі». Ён пашырае дадзеную групу, асноўваючыся на археалагічных дадзеных за кошт не толькі прадметаў зброі, але і выяў ваяроў [34, с. 149]. Да імітацыйнай групы цацак адносім цацкі «ружжо» і «лук». Такія цацкі імітавалі дарослыя прадметы. Цацкі-зброя захаваліся ў калекцыях Рускага этнаграфічнага музея. Яны ўсе паходзяць з пачатку XX ст. Напрыклад, цацка «лук» знойдзена Н.І. Лебедзевай у 1930 г. у в. Радзівілавічы Тураўскага раёна [36].

Цацкі *«ружжы»* і *«лівальверы»* з Беларусі ёсць шмат у якіх калекцыях РЭМа. Як ужо адзначалася, гэты від цацак з’явіўся позна, калі стаў шырока распаўсюджаным гэты від зброі нават сярод сялянства. Цацкі ў асноўным драўляныя, некаторыя з іх маюць металічныя дэталі і так па-майстэрску выкананы, што страляюць кавалкамі дрэва [35].

Ёсць прымітыўныя дзіцячыя *«стралялкі»,* некаторыя з іх выкананы самімі дзецьмі. Гэта звычайна прасвідраваная, пустая ўнутры трубачка, якая набівалася гарохам ці хлебнымі шарыкамі. Такая стралялка трапіла ў калекцыю РЭМа ў 1954 г. Яна відавочна зроблена дзіцём [37]. «Стралялка» больш дасканалага вырабу захоўваецца ў калекцыі РЭМа. Яна прадстаўляе драўляную трубку даўжынёй 22 см, дыяметрам 2,5 см, з дыяметрам адтуліны 1 см. Шомпал (драўляная круглая палачка, якая ўстаўляецца ў трубку) мае даўжыню 1 см. Да трубкі дадаюцца адмыслова зробленыя «кулі» (ад палачкі даўжынёй 9 см адразаюцца кавалкі). Цацка сабрана А.К. Сержпутоўскім у вёсцы Убібацька Бабруйскай акругі Любаньскага раёна БССР [38]. Часам да «стралялак» і «лівальвераў» дадаваліся фігуркі-мішэні, зробленыя з дрэва. Пра чатыры такія фігуркі ўзгадваецца ў кнізе паступленняў РЭМа [39]. Выкарыстанне «стралялак», «стрэльбаў», «ружжаў», «мушкетаў», «лівальвераў» павінна было вучыць дзяцей паляўнічаму майстэрству, трэніраваць меткасць. Беларусы жылі сярод лясоў, таму падобныя навыкі былі неабходнымі. Да таго ж асноўным заняткам дзяцей і падлеткаў была пастушкоўская справа. «Ружжы» і «стралялкі», «лукі», «рагаткі» неабходны былі пастушкам, каб адганяць дзікіх звяроў ад хатняй жывёлы. Сапраўдную зброю дзецям не давалі, у іх распараджэнні быў багаты асартымент «зброі» дзіцячай. Сучасныя дзеці і сёння выкарыстоўваюць цацачную зброю. Прамысловасць выпускае шмат цацак, якія прадстаўляюць зборою. У сялянскім асяроддзі і сёння дзеці вырабляюць некаторыя віды цацачнай зброі: «лукі», «стралялкі», «рагаткі» і г.д. Гэта звязана не з недахопам цацак, а з імкненнем дзяцей зрабіць штосьці ўласнымі рукамі. Такія цацкі часцей вырабляюць дзеці так званага «сярэдняга» школьнага ўзросту (12 - 14 год). Менавіта ў гэтым узросце ў гульнях дзяцей назіраецца ярка выяўленая палавая дыферанцыяцыя. Дзеці малодшага ўзросту гуляюць з усімі цацкамі не залежна ад узросту, старэйшыя дзеці лічаць гульню ў цацкі ўжо не вартай іх ўвагі. Паводле народных поглядаў беларусаў, - гэта дзіцячы ўзрост. Лічылася, што маленства цягнецца ад нараджэння да 6 - 8 гадоў, дзяцінства-адб - 8 да 12 - 14 гадоў, падлеткавы ўзрост - ад 12 — 14 да 16 - 17 гадоў, юнацтва - ад 16 - 17 да 18 - 20 гадоў [4, с. 111].

Акрамя гульнёвай і сацыялізуючай функцыі цацачная зброя магла выконваць таксама і магічныя функцыі. Археалагічныя і этнаграфічныя дадзеныя даюць магчымасць меркаваць, што некаторыя мініатурныя прадметы ў выглядзе стрэл, сякерак і іншых мелі сакральны сэнс.

Этнаграфічныя запісы XIX - пач. XX ст. утрымліваюць вялікую колькасць узгадак аб выкарыстанні каменных сякерак і «пяруновых стрэл» у лекавай і засцерагальнай магіі [17, с. 170]. Дзіцячая цацачная сякера ёсць у зборах РЭМа. Яна зроблена з дрэва, мае даўжыню 15 см. Знойдзена А.А. Мілерам у в. Любанаўка Чэрыкаўскага павета Магілёўскай губерні [41]. Параўноўваючы беларускія цацкі з цацкамі ў культуры суседніх народаў, можна знайсці аналогіі. Так, у палякаў цацкі ў выглядзе драўляных сякерак у XIX ст. у вялікай колькасці прадаваліся на Рэнкаўцы (у Кракаве) і былі звязаны з культам продкаў і абрадавымі бойкамі ў гонар продкаў [40, с. 36]. Сякеру лічылі атрыбутам ваяўнічых боставаў у розных народаў. У славян такім боствам быў Пярун. Сярод археалагічных знаходак у пахаваннях сустракаюцца цацачныя сякеркі, булавы і нажы. Спрэчным застаецца пытанне аб іх прызначэнні. Невядома, былі яны цацкамі, ці рытуальнымі прадметамі. Хутчэй за ўсё, гэтыя рэчы спалучалі магічную і гульнёвую функцыі, паколькі найчасцей іх знаходзяць у пахаваннях дзяцей.

*Гукавыя цацкі* - прадстаўляюць значную групу беларускіх народных цацак. Гэта рэчы, пры дапамозе якіх тым ці іншым спосабам здабываўся гук. У дадзеную групу можна ўключыць свістулькі, пішчалкі, бразготкі, жужалкі і г.д.

У зборах музееў гукавых цацак значная колькасць. Да гэтай групы адносяцца так званыя *«буркаўкі», «пішчалкі», «пагрэмушкі», «пукаўкі», «жужалкі», «трашчоткі», «званочкі»* і г.д. Шэраг такіх рэчаў захоўваецца ў Расійскім этнаграфічным музеі, знойдзена пад час этнаграфічных экспедыцый і археалагічных раскопак. «Шархуны», «трашчотка», «званочкі», «акарына», дзіцячая «бразготка» захоўваюцца ў Музеі старажытнабеларускай культуры ІМЭФ НАН Беларусі [42, с. 95]. Гэтыя цацкі выкарыстоўваліся дзецьмі не толькі для забавы, але і як музычныя інструменты, а таксама абярэгі ад злых сіл.

Цацка *«пішчык»* - зроблена з дзвух драўляных палачак, паміж якіх замацавана палоска бяросты, пры ўдзьмуванні паміж пласцінамі паветра, цацка дае рэзкі моцны гук. Цацка знаходіцца ў калекцыі РЭМа, трапіла туды ў 1924 г., паходзіць з Мінскай губерні Сенненскага павета Вязненскай воласці, сабрана А.К. Сержпутоўскім [43]. Прымітыўныя «пішчыкі» дзеці рабілі з травінак, гарохавых стручкоў,

галінак дрэў, саломінак. Пішчалку ўзгадвае ў канцы XIX ст. М.Я. Нікіфароўскі - «пры дапамозе травянога лістка дзеці ўлетку перадаюць пеўневае «кукарэку», у адзіночку і «на-піраспехі» [5, с. 172- 173]. Традыцыя вырабу дадзенага віду самаробных дзіцячых цацак захоўваецца сярод сельскіх дзяцей і зараз. Аўтарам зафіксавана некалькі спосабаў вырабу дзецьмі «пішчыкаў» («пішчалак») вядомых у сучаснасці. Да гукавых цацак можна аднесці і цацку *«салавей»*.

На паўночнай Беларусі часам сустракаюцца галёначныя косці дробных жывёл і птушак з прасвідраванай адтулінай - так званыя «жужаліцы», вядомыя і пазней па традыцыйных гульнях беларускіх дзяцей. Часцей за ўсё цацкі знаходзяць у магілах дзяцей [2, с. 636].

Цацка *«жужалка»* уяўляе сабой прасвідраваную костку, у якую адмыслова ўстаўлена выровачка. Кручэнне вяровачкі выклікае гук - гудзенне. Цацка паходзіць з Гомельскага ўезда [44]. Цацка дае дзіцяці забаву і разам з тым дапамагае атрымаць першасныя веды аб законах фізікі. Зразумела, што забаўляльная функцыя такой цацкі стаіць на першым' месцы. Аналагі такой цацкі вырабляюць сучасныя дзеці малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту, калі змяшчаюць гузік на нітку, потым раскручваюць яго. Пры кручэнні такая самаробная цацка дае не толькі гук, дзяцей забаўляе і сам працэс кручэння.

Аналагічная цацка - *«бурка»* («бурта»), якая пры кручзнні давала гук - «бурчэнне» (гудзенне). Гэтая цацка трапіла ў калекцыі Расійскага этнаграфічнага музея, дзякуючы А.К. Сержпутоўскаму, які знайшоў яе ў Мазырскім павеце Мінскай губерні ў 1910 г. і аднёс па прыналежнасці да цацак беларусаў-палешукоў [45]. *«Бурта»* прадстаўлена ў РЭМе і ў калекцыі Е.Р. Раманава, паходзіць яна з Быхаўскага павета Магілёўскай губерні, зроблена з косткі жывёлы [46]. Магчыма, цацкі выраблены самімі дзецьмі, аднак запісаў аб гэтым няма. Наступная цацка - *«буркалка»* зроблена відавочна дарослым, аб гэтым можна меркаваць па акуратнасці, з якой зроблена цацка. Яна прадстаўляе сабой кароткую свінную костку, прасвідраваную ў сярэдзіне. У адтуліну крыж-накрыж прасунуты вяровачкі з прымацаванымі да іх дзвума драўлянымі ручкамі. Пры нацягванні ручак костка круціцца з адмысловым гукам [47]. Гэтая цацка знойдзена А.А. Мілерам у 1908 г. у Чэрыкаўскім павеце. Цацка пад назвай «буркало», выробленая са свіной косткі і льняной ніткі жыхаром Н.С. Пацко з в. Высокае Пінскага раёна, захоўваецца ў Музеі Беларускага Палесся ў Пінску. Цікава, што падобная цацка ў рускіх называецца *«фурчалка», у* палякаў - *«буркаўка»,* у украінцаў - *«гуркало»* [48, с. 96]. У літаратуры вядома апісанне *«буркаўкі»,* запісанае К. Машыньскім у вёсцы Пузічы на Піншчыне [50, с. 595]. Яно дакладна паўтарае прынцып дзеяння падобных цацак з Чэрыкаўскага і Бахаўскага паветаў.

*Трашчотка (гжэготка)* з'яўляецца распаўсюджанай цацкай ва ўсіх славянскіх народаў. Іх выраблялі з розных матэрыялаў: гліны, дрэва, вантробаў жывёлы і г.д. Падобна свісту, лічылася, што трэск здольны быў адганяць злых духаў. Магчыма, таму трашчоткі часта сустракаюцца ў пахаваннях дзяцей. Звычай класці цацкі ў магілы дзяцей быў вядомы яшчэ ў старажытнай Грэцыі і Рыме. Бацькі, якія гэта рабілі, былі перакананы, што дзіцяці будзе лягчэй прыстасавацца да новага стану, калі побач будуць любімыя цацкі. Першай і найпалулярнейшай цацкай, якая давалася малым у Грэцыі, была трашчотка, зробленая з тэракоты накшталт шарыка з каменьчыкам унутры [3, с. 29]. Гакія цацкі былі вядомы і на тэрыторыі Беларусі, Расіі, Польшчы і ўвогуле ўсёй Еўропы. Падобныя трашчоткі, якія паходзяць з тэрыторыіі Беларусі, захоўваюцца зараз у многіх музеях Беларусі, Расійскім этнаграфічным музеі Санкт-Пецярбурга і г.д. У Рыме разам з тэракотавымі цацкамі выкарыстоўвалі трашчоткі, зробленыя з бронзы, абвешаныя званочкамі. Паводле легенды, трашчотку вынайшаў грэчаскі матэматык і філосаф, прыяцель Платона, Архітас (на мяжы V - IV ст. да н.э.) для сваіх дзяцей, якія перашкаджалі яму займацца роздумам [48, с. 83].

У палякаў трашчоткі выкарыстоўваліся на свята Рэнкаўкі і пад час Эмаўсавага кірмашу. Пазней, прыстасаваўшы іх да хрысціянскай традыцыі іх сталі выкарыстоўваць у перыяд з Вялікага Чацвярга да Вялікай Суботы. Лічылася, што як і званы на храмавых вежах, *«трашчоткі»* адганяюць д'ябла [40, с. 40 - 41]. У беларусаў традыцыя вырабу трашчотак-ветрачкоў дажыла да сённяшняга дня. Яны страцілі апатрапейную сімволіку і выкарыстоўваюцца ў якасці дзіцячай забавы, а таксама як сродак адпужвання птушак. Цікавы арнамент польскіх «трашчотак» («гжэготак», «бразготак»): вялікія і маленькія кружочкі. Такі ж арнамент маюць гліняныя шарыкі, што паходзяць з тэрыторыі Беларусі і захоўваюцца ў Кракаўскім этнаграфічным музеі. Шары зроблены з гліны, не маюць палівы. Некаторыя з іх утрымліваюць у сярэдзіне каменьчык і пры патрэсванні даюць гук. Такія ж шары з тэрыторыі Беларусі захоўваюцца ў Расійскім этнаграфічным музеі, некаторых беларускіх музеях. «Бразготкі» знойдзены на тэрыторыі старажытных гарадоў Гродна, Ваўкавыск, Магілёў, Мсціслаў і інш. [50, с. 519]. Бразготкі, зробленыя з гліны, часам лаліваліся.

Сустракаюцца ў археалагічных раскопах і зборах музееў *«бразготкі»* ў выглядзе жывел. Назвы цацак зафіксаваны Е.Р. Раманавым у 1904 г. пад час фармавання калекцыі беларускіх цацак для Этнаграфічнага аддзела Рускага музея. Зараз цацкі знаходзяцца ў Расійскім этнаграфічным музеі [51]. «Бразготкі» выраблялі і з дрэва. Звычайна гэта былі вытачаныя на дрэваапрацоўчым станку авальныя на доўгай ножцы [52], ці складзеныя з дошчачак квадратныя каробачкі ў сярэдзіне якіх змяшаўся каменьчык

[53]. Зафіксавана этнографамі-збіральнікамі і назва *«пагрэмушка».* Паводле кнігі паступленняў такую назву мае авальная цацка, вытачаная на такарным станку, на драўлянай ножцы. Даўжыня яе 18 см. Цацка пафарбаванаў сіні, зялёны і чырвоны колер. Сабрана А.Я. Дунсбургам у 1930 г. [54]. Беларускія майстры выраблялі іншы від трашчотак - змешчаныя на круглай палачцы некалькі дошчачак пры абарачэнні вакол яе давалі гучны трэск. Стылістычна такія вырабы блізкія да вырабаў суседніх народаў - палякаў, рускіх, чэхаў, славакаў [55, с. 86]. Беларускія цацкі адрозніваюцца тым, што яны не афарбаваны. Толькі ў кан. XIX - пач. XX ст. цацкі сталі фарбаваць у сувязі з пашырэннем штучных фарбавальнікаў і як перайманне больш яркай цацкі суседніх народаў. З тонкіх фарбаваных дошчачак прамавугольнай формы, афарбаваных у сіні колер, на круглай ручцы зроблена бразготка з Магілёўскай губерні [56].

Дзіцячыя музычныя інструменты складаюць асобную групу цацак. Дзеці здаўна бавіліся тым, што прыстасоўвалі прыродныя рэчы для атрымання з іх гукаў. Часова музычным інструментам магла стаць любая травінка ці галінка дрэва, якая давала гукавы рад. Такія рэчы не калекцыяніравалі. Кожны дзень дарыў новую забаву. Дзеці-пастушкі рабілі з трасніку *дудачкі, жалейкі, трубы, бразгаўкі, званочкі* і г.д. Лічылася, што гук званочкаў адганяе злыя сілы. У палякаў, напрыклад зафіксаваны звесткі з XIX ст. аб тым, што напярэдадні Вялікадня дзеці павінны былі званіць у званочкі і трашчоткі, адганяючы зло ад хат і людзей [40, с. 39]. Вядомы такі звычай і ў беларусаў у XIX ст. не толькі ў Вялікдзень, але і пад час навальніцы, каб маланка не трапіла ў дом [57, с. 44]. Для забавы дзяцей выкарыстоўвалі *«капшук»*- высушаны мачавы пузыр хатніх жывел, у які насыпалі высушаныя зерні бобу, ці гароху [57, с. 52]. Вядома цікавая разнавіднасць бразготкі ў беларусаў - *«горла»* цацка з высушанага гусінага, індычынага горла, у якое насыпалі зярняткі, каменьчыкі. Пры патрэсванні такая цацка давала шамацячы гук [57, с. 53].

Цацачная «*труба*»- музычная цацка, зробленая з дрэва і абвітая бяростай. Знаходзіцца ў зборах РЭМа, паходзіць з кан. XIX - пач. XX стст. Гэтыя назвы зафіксаваны Е.Р. Раманавым у 1904 г. пад час фарміравання калекцыі беларускіх цацак для Этнаграфічнага аддзела Рускага музея. Зараз цацка знаходзіцца ў Расійскім этнаграфічным музеі [58]. Гэтыя дзіцячыя музычныя інструменты сталі своеасаблівым рамантызаваным сімвалам сялянскай «сярмяжнай» Беларусі. Але вядома пра іх не шмат. У зборах музееў яны сустракаюцца рэдка. Часам, цяжка размежаваць у музейных зборах музычныя цацкі і народныя музычныя інструменты, у такім выпадку за аснову прымаецца памер рэчы. Дзіцячыя музычныя інструменты капіравлі «дарослыя». Найбольш сярод дзяцей маюць каштоўнасць менавіта такія цацкі, якія «як сапраўдныя». Гэтая асаблівасць вынікае з дзіцячай псіхалогіі, імкнення да імітавання дарослых.

*Імітацыйныя цацкі* - да гэтай групы можна аднесці ўсе цацкі, якія паўтараюць сапраўдныя рэчы. У гэтую групу могуць уваходзіць цацачныя музычныя інструменты, цацачныя трансгіартныя сродкі - дзіцячыя санкі, конікі-каталкі, цацачную мэблю, посуд і г.д. Па сутнасці гэтую групу складаюць паменшаныя копіі прадметаў побыту, якія выкарыстоўваюцца дзецьмі для гульні. Некаторыя з пералічаных прадметаў апісаны ў межах іншых груп, аднак, ёсць прадметы, якія тыпалагічна не ўвайшлі ў папярэднія групы, напрыклад, цацачная мэбля. Цацачная мэбля дакладна паўтарала ўзоры сапраўднай мэблі. Выраблялася яна з дрэва. У народнай цаццы гэта дастаткова позняя з'ява. Майстры-дрэваапрацоўшчыкі пачалі рабіць цацачную драўляную мэблю, паўтараючы замежныя ўзоры лялечных домікаў, якія прыйшлі да нас з захаду.

Цікава, што ў цацках імкнуліся паўтарыць усе рысы побыту, у тым ліку і дзіцячага. Так, у зборах РЭМа захоўваецца дзіцячая цацка «люлька»- сшытая з луба цацачная калыска для немаўляці. Яна мае даўжыню 14 см, шырыню - 8,5 см і вышыню - 4 см. Цацку ў зборы музея прывез А.А. Мілер з вёскі Любанаўка Чэрыкаўскага павета Магілёўскай губерні ў 1908 г. [59].

" Сярод імітацыйных цацак нярэдка сустракаюцца дзіцячыя ўпрыгожанні. Яны ў вялікай колькасці вырабляліся і зараз вырабляюцца дзецьмі (асабліва дзяўчынкамі), але ў такіх цацак нядоўгі век. Улічваючы гэта, каштоўнымі з'яўляюцца мапенькія драўляныя каралі («кралы») для дзяўчынкі, якія захоўваюцца ў РЭМе. Паводле апісання, яны трапілі ў зборы ў 1904 г. ад Е.Р. Раманава, якому падаравалі гэтае дзіцячае ўпрыгожанне ў Быхаўскім павеце Магілёўскай губерні [60].

Сярод цацак, якія вядомы са старажытнасці, да нас дайшлі дзіцячыя санкі. Цяжка сказаць, ці можна гэты прадмет, прызначаны для перамяшчэння назваць цацкай, аднак тое, што дзеці ў зімовы час выкарыстоўваюць яго ў гульнях, дае падставу лічыць, што ён выконвае функцыі цацкі. У музейных зборах захаваліся санкі, якімі карысталіся дзеці ў XIX ст. Захаваліся таксама і лакальныя назвы дзіцячых санак - «качкі» (паводле запісаў А.А. Мілера). З тэрыторыі Беларусі ў РЭМе захоўваецца двое дзіцячых санак. Адны з іх прызначаны для катання дзіцяці і маюць даўжыню 55 см, паходзяць з вёскі Лабанаўка Чэрыкаўскага павета [61], другія «санкі»- мініатурная копія, маюць даўжыню 13 см і, відавочна, прызначаны для «катання» лялек [62].

*Рухомыя цацкі* - дзіцячыя цацкі, дзейнасць якіх заснавана на руху. Да гэтай групы адносяць і тыя цацкі, якія імітуюць дарослыя прадметы, і такія, аналагаў якім у культуры дарослых няма.

Шырока распаўсюджаны сярод гэтых цацак гэтай групы *«ваўчкі».* Такая назва гэтым цацкам дадзена паводле апісання Е.Р. Раманава калекцыі, сабранай у 1905 г. у Магілёўскай губерні Сенненскага

павета. Цацку рабілі звычайна з дрэва, маглі фарбаваць рознакаляровымі фарбамі. У вопісе калекцыі апісана такая цацка, пафарбаваная ў чырвоны колер з трыма чорнымі палоскамі. А вось «ваўчок»з іншай калекцыі не мае афарбоўкі. Сустракаецца іншая назва такой цацкі - *«крутора»*. У рускай цацццы таксама сустракаецца *«волчёк»*. Адзін з даследчыкаў дзіцячых гульняў выводзіць назву *«ваўчок»* ад таго, што цацка пры кручэнні дае гук, падобны да завывания ваўка [48, с. 94]. Падобнымі паводле прынцыпа дзеяння, заснаванага на кручэнні па энерцыі пад уздзеяннем цэнтрабежных сілаў, з'яўляюцца рознага роду «кубары»[48, с. 92].

Рускі даследчык дзіцячых гульняў XIX ст. Я.А. Пакроўскі называв каля 30 розных відаў «ваўчкоў» і адзначае, што яны былі распаўсюджаны ва ўсіх краінах Еўропы. Ён узгадвае «ваўчкі», якія змяшчаліся на вяроўцы, маглі спускацца з гары, складаліся з розных дэкаратыўных частак. Даследчык узгадвае яшчэ адну, падобную да «ваўчка»цацку ў рускіх - «кубар»[48, с. 93]. Прынцып дзеяння дадзеных цацак адзін і той жа - кручэнне апасрэдаванае нададзенай ім знешняй сілай. Сустракаецца такая назва цацкі, заснаванай на прынцыпе кручэння, як «крутора», зафіксаваная ў Магілёўскай губерні Быхаўскага павета. Па знешняму выгляду цацка падобна да «ваўчка»[63]. Паходжанне «ваўчка»звязваюць з салярнымі культамі.

Такім чынам, *цацкі-прылады для гульні* з'яўляюцца асобнай групай беларускіх народных цацак. У гэтую трупу ўваходзяць: гульнёвы інвентар, імітацыйныя цацкі, цацачны посуд, гукавыя цацкі, мячы, мурмельшпігель, цацкі ў выглядзе яек, рухомыя цацкі, цацачная зброя. Некаторыя цацкі (цацка-яйка, ваўчок, мяч, трашчотка і г.д.) выконвалі некалі сакральную функцыю, у XX ст. захавалі толькі гульнёвыя функцыі.

Узоры беларускіх традыцыйных цацак-прылад для гульні захаваліся і дайшлі да нас ў зборах музеяў, найбольш поўнымі з якіх з'яўляюцца зборы Музея старажытнабеларускай культуры Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі, Рускага этнаграфічнага музея.

Адзінкавыя экземпляры цацак захоўваюцца ў рэгіянальных музеях Беларусі і за яе межамі. Цацкі, якія захаваліяся ў зборах музеяў, знойдзеныя пад час археалагічных раскопак, даюць магчымасць рэканструяваць набор традыцыйных цацак беларусаў, што ўжываліся ў XIX - XX стст.

ЛІТАРАТУРА


1. Народная культура Беларуси: Энцыкл. давед. / Пад агул. рэд. В.С. Цітова; Маст. І.І. Бокі, У.М. Жук. Мн.: БелЭн, 2002.-432 с.
2. Археалогія і нумізматыка Беларуси:Энцыклапедыя / Беларус. Энцыкл.: Рэдкал.: В.В. Гетаў і інш. Мн.: БелЭн, 1993.-702 с.
3. Bujak J. Zabawki w Europie. - Kraków: Nakladem Unowersytetu Jagielońskiego, 1986. - 217 s.
4. Беларусы: У 8 т. Т. 5. Сям'я. / В.К. Бандарчык, Г.М. Курыловіч, Т.І. Кухаронак і інш. - Ми.: Бел. навука, 2001. - 375 с.
5. Никифоровский Н.Я. Очерки Витебской Белоруссии. Т. VI: Игры и игроки // Этнографическое обозрение. - М., 1897. - № 3. - С. 21 - 66; Очерки Витебской Белоруссии. II: Дудар и Музыка // Этнографическое обозрение. - М., 1892. - Кн. 13 - 14. - № 2 - 3. - С. 172- 174.
6. Беларускія народныя гульні / Уклад. К.Л. Лабачэўская. - Мн., 1990. - 32 с.
7. Расійскі этнаграфічны музей - кніга паступленняў (далей - РЭМ - КП) - 4164-50.
8. РЭМ-КП-515-14, 15.
9. Гульні, забавы, ігрышчы / Пад рэд. В.К. Бандарчык, К.П. Кабашнікаў, А.С. Фядосік (гал. рэд.) / Склад. А.Ю.Лозка. - Мн.: Беларуская навука, 2000. - 534 с.
10. РЭМ-КП-515- 19,20.
11. РЭМ - КП - 4667-99 а, б, с.
12. РЭМ-КП -515-13.
13. Бернштам Т.А. Мяч в русском фольклоре и обрядовых играх // Фольклор и этнография: У этнографических истоков фольклорных сюжетов и образов: Сб. науч. тр. - Л.: Наука, 1984. - С. 162-171.
14. Церетелли Н.М. Русская крестьянская игрушка. - М.: Academia, 1933 - 261 с, ил.
15. РЭМ - КП - 4745/ «Д» а, в.
16. Коваль У.І., Новак В.С. Беларускія народныя святы і звычаі. - Гомель, 1993. - 88 с.
17. Сержпутоўскі А.К. Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў. / Прадм. У.К. Касько; Маст. В.Р. Мішчанка. - Мн.: Універсітэцкае, 1998. - 301 с.
18. Ракава Л.В. Традыцыі сямейнага выхавання ў беларускай весцы. - Мн.: Ураджай, 2000. - 111 с.
19. Рыбаков Б.А. Язычество древних славян. - М.: Наука, 1994 - 607 с.
20. Элиаде М. Аспекты мифа: Пер. с франц. - М.: Академический проект, 2000. - 222 с.
21. Журавлев А.Ф. Домашний скот в поверьях и магии восточных славян. Этнографические и этнолингвистические очерки. - М.: Индрик, 1994. - 256 с.
22. Иваницкая З.Н. Писанка. - М.: Мир, 2001. - 64 с.

23. Казакова I.В. Этнічныя традыцыі ў духоўнай культуры беларусаў. - Мн.: Універсітэцкае, 1995. - 151 с.
24. Романов Е.Р. Белорусский сборник. Т. 1. - Вып. 8-9. Опыт словаря условных языков Белоруссии с параллелями великорусскими, малорусскими и польскими. - Вильна, 1912. - 724-с.
25. Кайуа Роже Миф и человек. Человек и сакральное / Пер. с фр. и вступ. ст. С.Н. Зенкина. - М.: ОГИ, 2003.-296 с.
26. Милюченков С.А. Белорусское народное гончарство. - Мн.: Наука и техника, 1984. - 183 с.
27. РЭМ - КП - 4744/Д.
28. РЭМ - КП - 725-33/а, в, с; 725-34/а, в; 725-35/а, в.
29. РЭМ-КП-725-36; 725-37; 725-38.
30. РЭМ-КП-4744.
31. РЭМ-КП-725-41.
32. РЭМ - КП - 549-26.
33. РЭМ-КП-4741/Да, в.
34. Плавінскі М.А. Мілітарныя цацкі XII - XIII стст. з тэрыторыі Беларусі (да пастаноўкі праблемы) // Пстарычны альманах / Рэд. А. Краўцэвіч, А. Смалянчук, С. Токць. - Мн., 2001. Т. 5. - С. 149 - 156.
35. РЭМ - КП - 4750/Д.
36. РЭМ-КП- 549-35.
37. РЭМ - КП - 4746/Д.
38. РЭМ - КП - 4667-96 а, б, с.
39. РЭМ-КП-4667-98.
40. Seweryn T. Polskie zabawki ludowe. - Warszawa, 1960. - 131 s.
41. РЭМ-КП-1292-15.
42. Музей старажытнабеларускай культуры: Дапаможнік для наведвальнікаў / Пад рэд. В.Ф. Шматава. - Мн.: Бел. навука. 1998. -236 с.
43. РЭМ-КП-4164-49.
44. РЭМ - КП - 524-39.
45. РЭМ-КП-2107-163.
46. РЭМ-КП-515-22.
47. РЭМ-КП- 1292-121.
48. Покровский Е.А. Детские игры: преимущественно русские. - М.: ТЕРРА «Книжная лавка - РТР», 1997.-416 с.
49. Moszyński K. Kultura ludova Slowian. - Warszawa: Ksiąžka i wiedza, 1968. - T.2. - Cz. 2.-1111 s.
50. Беларуская цацка і гульня. Матэрыялы ў дапамогу стваральнікам цацак і гульняў на аснове беларускага народнага мастацтва; этнаграфіі і фальклора / Склад. А.Ю. Лозка, А.К. Лявонава - Мн.: БЦГЦ, 1996.-57 с.
51. РЭМ - КП - 515-12-17.
52. РЭМ-КП-5218-61.
53. РЭМ-КП-549-21.
54. РЭМ-КП-5218-61.
55. Сахута Я.М. Народнае мастацтва Беларусі.- Мн.: Полымя, 1997. - 287 с.
56. РЭМ - КП - 4748Д.
57. Назіна 1.Д. Беларускія народныя музычныя інструменты. - Мн.: Беларусь, 1997. - 239 с.
58. РЭМ - КП - 4751/Д.
59. РЭМ-КП- 1292-116.
60. РЭМ-КП-515-16/1-10.
61. РЭМ-КП- 1292-122.
62. РЭМ - КП - 4749/Д.
63. РЭМ-КП-515-17.